# Аб публічным цэнтры прававой інфармацыі

Аб публічным цэнтры прававой інфармацыі

У мэтах забеспячэння рэалізацыі права грамадзян на атрыманне поўнай, дакладнай і своечасовай прававой інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь створана дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі.

Адным з яе элементаў з'яўляюцца публічныя цэнтры прававой інфармацыі, якія створаны **Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь** сумесна з **Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь** на базе дзяржаўных публічных бібліятэк.

Публічны цэнтр прававой інфармацыі - пункт свабоднага доступу грамадзян да эталоннай прававой інфармацыі. Мэта ПЦПІ - забеспячэння фарміравання прававых ведаў, навыкаў правамерных паводзін, паважлівага стаўлення да права і садзейнічання правядзенню мерапрыемстваў па прававой асвеце грамадзян.

Задачамі публічнага цэнтра прававой інфармацыі з'яўляюцца:

- арганізацыя свабоднага доступу грамадзян да эталоннай прававой інфармацыі;
- фарміраванне фонду перыядычных і неперыядычных друкаваных і электронных выданняў, дзяржаўных інфармацыйна-прававых рэсурсаў, якія змяшчаюць эталонную прававую інфармацыю, матэрыялаў навукова-практычнага характару, якія спрыяюць поўнаму і адэкватнаму ўспрыманню грамадзянамі іх правоў і абавязкаў;
- выкарыстанне эфектыўных форм і метадаў бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў мэтах фарміравання ў грамадзян прававых ведаў, навыкаў правамерных паводзін, паважлівага станаўлення да права.